Источник: "Звязда" - 2012-10-12

## ■ Сусветны дзень барацьбы з артрытам

# Праверка для суставаў

**З 12 па 28 кастрычніка ў цэнтральных раённых і гарадскіх паліклініках усіх раёнаў сталіцы, медыка-санітарных частках заводаў, паліклініцы Акадэміі навук можна будзе праверыць сваё здароўе на прадмет развіцця астэаартрозу.**

Паводле слоў галоўнага рэўматолага Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Наталлі МАРТУСЕВІЧ, рэўматычныя захворванні — гэта вялікая група розных па паходжанні запаленчых і дэгенератыўна-метабалічных хвароб, якія паражаюць злучальную тканку (суставы, храсткі, косці, калясустаўныя тканкі), а таксама сасуды, унутраныя органы, скуру, слізістую. У апошняе дзесяцігоддзе адзначаецца выражаны рост колькасці хвароб косна-мышачнай сістэмы і злучальнай тканкі, у тым ліку ў дзяцей і падлеткаў. Курэнне, ужыванне алкаголю, гіпадынамія, лішняя вага, атлусценне ў шэрагу выпадкаў запускаюць развіццё і спрыяюць абвастрэнню рэўматычных хвароб. Запаленчыя рэўматычныя захворванні абгрунтавана разглядаюцца як фактары рызыкі развіцця ранніх атэрасклератычных змяненняў сценкі артэрый, у выніку чаго маюць месца інфаркты міякарда, інсульты, трамбозы іншых буйных сасудаў. «Недаацэнка важнасці праблемы ў суставах і пазваночніку прыводзіць да таго, што пацыенты позна звяртаюцца да спецыялістаў», — адзначае спадарыня Мартусевіч.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

Святлана Барысенка. Праверка для суставаў